

Фрагмент першай старонкі рукапіса П.Сяўрука.



Адна з паштовак беларускага дзеяча Ігната Дварчаніна да П.Сяўрука.



# Дэкляlarацыя.

Бланк заявы з патрабаваннем вучыць дзяцей па-беларуску. Сярэдзіна 1920-х г.



Гурток Таварыства беларускай школы ў Скідзелі. 14 красавіка 1927 г. Першы рад злева направа – Марыя Фамінічна Шань, Захар Ільіч Кемяжук, Захар Босы, Ганна Гуліда, Сцяпан Цывінскі, Пётра Якаўлевіч Сяўрук, Іван Рыгоравіч Дзелянкоўскі, Рыгор Канстанцінавіч Мазалеўскі, Вера Сытая, Аляксандр Канстацінавіч Мазалеўскі, невядомая нам. Сярэдні рад – Рыгор Аляксандравіч Лiтвін, Пётр Пятровіч Бурэц, Аляксандр Цывінскі, Рыгор Цывінскі, Ганна Ілінічна Кемежук, Аляксандр Захаравіч Мазалеўскі, Лiтвін з Глінянаў, Андрэй Мазалеўскі, Вера Андрэеўна Сяўрук. Верхні рад – Аляксандра Міхайлаўна Войтас, Іван Рыгоравіч Сяўрук, Вольга Ігнатаўна Парай, Марыя Якаўлеўна Сяўрук, Іван Шыла, Вольга Якаўлеўна Сяўрук.



Удзельнікі акруговага з'езду ТБШ у Горадні. 10 красавіка 1927 г. У другім радзе чацвёрты злева Пётр Сяўрук.



Удзельнікі акруговага з'езду ТБШ у Горадні. 12 ліпеня 1928 г. У першым радзе другі злева – паэт Міхась Васілёк (сапр. Міхал Касцевіч). У другім радзе 3-ці злева Аляксандр Уласаў, 4-ы злева – Рыгор Шырма. У трэцім радзе 2-і злева Пётр Сяўрук, чацвёртая злева – сястра Пятра Вольга Сяўрук.



Сакратар скідзельскага гуртка ТБШ і прыхільнік КПЗБ Іван Дзелянкоўскі. Здымак зроблены 6 лютага 1927 г. І.Дзелянкоўскі загінуў у фашысцкім канцлагеры Штутгоф (фота з сямейнага архіву Маргарыты Францавай).



Сябра скідзельскага гуртка ТБШ і прыхільнік філасофіі непраціўлення злу насіллем Даніла Скварнюк. Загінуў у ліпені 1943 г. разам з жонкай Вольгай Сяўрук у спаленай фашыстамі вёсцы Пузавічы. Стаў прататыпам галоўнага героя ў апавяданні Янкі Брыля “Memento mori” (фота з сямейнага архіву Маргарыты Францавай).



Сяброўкі скідзельскага гуртка ТБШ Марыя Шань і Вера Сытая (фота з сямейнага архіву Маргарыты Францавай).



Сябра скідзельскага гуртка ТБШ і прыхільнік філасофіі непраціўлення злу насіллем Аляксандр Мазалеўскі. Быў жанаты на Марыі Сяўрук. За прынцыповую адмову служыць у войску шмат гадоў правёў у турме. Памёр ад сухотаў неўзабаве пасля вызвалення. Здымак зроблены 8 жніўня 1929 г. (фота з сямейнага архіву Маргарыты Францавай).



Сябры скідзельскага гуртка ТБШ і прыхільнікі “талстоўства”: (злева направа) Вольга Сяўрук, Даніла Скварнюк, Рыгор Быцкевіч, невядомы нам, Марыя Сяўрук. Здымак 1930-х гадоў (фота з сямейнага архіву Маргарыты Францавай).



Прыхільнікі філасофіі непраціўлення злу насіллем. У першым радзе злева направа: Даніла Скварнюк, невядомая нам пацыфістка з Варшавы, Іван Шмойла. У другім радзе: Вольга Сяўрук, Аляксандр Мазалеўскі, Марыя Сяўрук.